5 ноября, четверг
1998 г.
N37

Приложение - программа ТВ.
Цена - 6000 руб.

Биржа информации

до окончания полномочий президента согласно Конституции 1994 г.

осталось 258 дней

пристрастные заметки

Почем нынче журналисты?

Ведущая журналистка оппозиционной "Народной воли" Людмила Маслюкова перешла в президентскую "Советскую Белоруссию". Этот факт уже достаточно обсосан, и комментарии, как говорится, излишни. Поменял человек место работы, даже такой известный в республике, кто против?

Я - против. Журналистика - не совсем работа, это выбор, судьба. Мне трудно представить, что человек, который вчера ругал режим и был в оппозиции, а сегодня готов писать одиозные (от слова "ода", замечу) статьи в адрес президента, является журналистом в том понимании, которое вкладывается в этот термин. Независимо от времени и страны, в которой живешь, высшим успехом для человека моей профессии является доверие читателя. Когда не верят твоей информации, когда тебя перестают слушать - на кой ляд писать вообще? Ходят слухи, что смена оппозиционных настроений Маслюковой на настроения пропрезидентские - оценивается в 10 тысяч долларов, высокую стабильную зарплату и другие блага.


Выходит, то, что не смогли сделать власти с независимыми журналистами при помощи давления, теперь они "исправляют" при помощи денег? А журналисты из верных слуг демократии, оказывается, могут запросто превратиться в прислужников режима. Кроме того, этот прецедент даст право очень многим считать, что покупается все, в том числе совесть и убеждения. Я не удивлюсь, если завтра кто-то тыкнет в меня пальцем и ухмыльнется: мол, знаем-знаем сколько стоит ваша независимость... Короче, напоминание о том, что моя рофессия ровесница древнеейшей, меня вовсе не радует.

Второе - против. Уже бывший соратник Маслюковой, сотрудник "Народной воли" В.Щукин заметил в "Свободных новостях" - ***"У войны не женское лицо. Маслюкова - женщина. У нее дочь на выданье. С мужской колокольни осуждать женщину недопустимо в принципе. Это мы можем забыть про жену и детей и воевать до конца. А женщина в первую очередь должна думать про семью"***. Вероятно, мой коллега-мужчина, хотел сказать в наш, женский, адрес что-то хорошее и теплое. Но, пардон. Это ни что иное, как мягкий мужской шовинизм. Профессия не делит нас по половому признаку. Более того, это единственное, что вообще может действительно уравнять в правах женщин и мужчин. Нелепо было бы предполагать, что, летальный исход операции "под управлением" дамы-хирурга и по ее вине, менее смертелен, чем - хирурга-мужчины. Или - воровка заслуживает меньшего наказания, чем вор. Или - журналистка может писать всякие глупости, а вот журналист - ему непростительно! Кстати, замечание ***"это мы можем забыть про жену и детей"*** отражает потрясающий уровень мужской ответственности. Сегодня забыл про жену, завтра про детей, послезавтра и про Родину забудет, не сомневайтесь!

Ответственность и совесть каждого по отношению к собственным поступкам - в профессиональной ли сфере, в личной жизни или на политическом поприще - единственное, что может придать обществу цивилизованные очертания. К феминисткам себя не отношу.

Елена РАВБЕЦКАЯ,
редактор и журналист.

Пагром у рэдакцыі газеты "Навіны"



Уноч з суботы на нядзелю невядомыя праз фортку забраліся ў памяшканне мінскай рэдакцыі газеты "Навіны". Яны цалкам знішчылі ўсю кампутарную тэхніку, архіў і навогул усё неабходнае для выпуска газеты. Прычым, зроблена ўсё гэта было са слядамі асаблівай жорсткасці. З памяшкання бандыты нічога не вынеслі і, відавочна, вылезлі назад праз фортку.

У мінулы аўторак газета ў друк не выйшла. Знішчанае абсталяванне каштуе вялікіх грошай, і ўзнавіць усю гэту тэхніку, і асабліва архіў, рэдакцыі будзе даволі няпроста. Вядзецца следства.

Нагадаем, што "Навіны" з'яўляюцца апазіцыйным выданнем да існуючага ў Беларусі рэжыму. Больш таго, рэдакцыя стала пераемніцай закрытай уладамі газеты "Свабода". І да ўсяго, гэта вельмі цікавае, аб'ектыўнае і шырока папулярнае выданне на Беларусі.

(Ул. інф.)

"Женщины вытащили бы страну"

100 телефонных звонков гродненцам

Со времен приснопамятной Тамары Винниковой белорусский политический Олимп не освящался более-менее заметной представительницей женского пола. Кабинет Министров - сплошной "мальчишник". Имен и лиц "парламентских" женщин простые обыватели не знают. В местном руководстве тоже преобладают мужчины. Где-нибудь "за бугром" такое положение вещей уже давно стало бы поводом для феминистских судов и журналистских расследований. Мы пока ограничимся опросом.

Справедливо ли, что в Беларуси на руководящих постах практически нет женщин?

Отвечая на этот вопрос, наши случайные собеседники разделились на две категории - женщин и мужчин. Первых оказалось подавляющее большинство - 74 человека, все были возмущены своим положением в родной политике:

"Это неправильно. У нас мужчины то ли спились, то ли из-за того, что живут в тепличных условиях, не привыкли к ответственности - они не могут заботиться о собственной семье, а не то что о государстве. Они гораздо слабее женщин. Умный руководитель сейчас если поручает какое-то дело - то женщине. Потому что женщина все сделает ответственно и досконально".

"Абсолютно несправедливо. Потому что мужчины представляют точку зрения специфично мужскую, а у женщин другой взгляд - более мягкий, мудрый. Недаром в других странах есть женщины - военные министры, к сожалению, мало их. У нас женщина хороша была бы в руководстве милицией. А так, посмотрите - в здравоохранении области - одни мужчины..."

"Несправедливо. Мне кажется, что мы умнее, более практичны, а то "эти" ничего не понимают. Женщины, может быть, и вытащили бы страну, а то "эти" умеют только ездить на хоккей с двумя "шкафами" за спиной".

"Мудрость и умение предвидеть - вот, что нас отличает. Умение именно наше, славянских женщин, терпеть. Мужчины более мощно бьют, но короче, а женщины, как та капля воды".

"Женщина ближе к жизни. Лучше понимает окружающую жизнь".

Впрочем, дискриминация, по мнению наших собеседниц не является основной причиной такого положения вещей:

"Видно, женщины не стремятся в руководство".

"Жещины практически все стараются создать семью, посвящают этому всю жизнь, а карьера для них - не главное".

"Наверное, женщин не допускают".

"Ну, вряд ли кто-то не пускает женщин в руководство.Просто на них столько ответственности лежит, и мужчины не хотят разделить эту ответственность".

Тем не менее, женщины "всегда готовы" ухватиться за бразды правления. Некоторые наши землячки сходу предлагали законопроекты:

"Женщина должна работать меньше, чем мужчина. А не так, что раз она работает, то ее нагружают, как ломовую лошадь..."

"Я бы разогнала эту банду! И поставила бы нормальных людей, специалистов. Колхозник бы занимался колхозами, банкир - банками!"

Вторая группа - 25 мужчин - горячо приветствуют недостаток женщин-руководителей:

"Может быть, именно в этом спасение Беларуси!"

"Я вообще не хочу отвечать на такой вопрос! Справедливо, я считаю, станет тогда, когда наступит улучшение, а я не вижу, что улучшение наступит, будет там женщина или мужчина! Женщина создана, чтобы рожать и растить детей, а мужчина должен содержать семью и заниматься руководством!"

"Как гражданин, я признаю, что женщины должны быть в руководстве. Я понимаю, что все хотят места под солнцем, своего хлеба с маслом и черной икрой. Женщины тоже этого хотят. А как человек - я тиранствующий тип по отношению к женщинам. Я им не доверяю. Женщина может очень многое сделать лучше мужчины, но им нельзя быть в таком количестве представленными в руководстве, как мужчины!"

"Это несправедливо, но "баба с возу - кобыле легче". И мужику".

Внемногочисленных рядах наших собеседников наметился идеологический раскол: нашелся-таки один представитель сильного пола, солидарный с нашими респондентками:

"Женщины более трезво смотрят на вещи, они толковее и умнее. А мужчины только "политикой" занимаются. С женщинами и договориться проще, если что - они поймут и помогут. Я часто вижу женщин-руководителей: есть среди них стервы, но дур почти нет. Среди мужиков больше".

Главное, что мы почерпнули из опроса - сознание гродненского общества медленно, но верно трансформируется. Само соотношение ответивших: 74 женщины и 26 мужчин - уже свидетельствует о большей контактности и социальной активности представительниц прекрасного пола. Монолитное единодушие респонденток, правда, не предполагает борьбы - 86% опрошенных женщин признались, что семья для них дороже карьеры.

И.ПЫТАВКА

Лукашэнка святкуе рускую рэвалюцыю. У Заходняй Беларусі адзначалі Дзяды

Дзяды - народны памінальны абрад, рытуальная вячэра ў памяць памерлых продкаў. Паходзяць Дзяды з дахрысціянскага ўсходне-славянскага звычаю трызны; звязаны з культам продкаў, пазней абрад ускладніўся напластаваннем хрысціянскага культу.

Адно з самых старажытных святаў беларускага народа па загаду прэзідэнта Лукашэнкі цяпер не лічыцца афіцыйным у нашай краіне. Выхадны дзень, у які ўсе людзі маглі ісці на могілкі, каб ушанаваць сваіх блізкіх, цяпер скасаваны. Затое святочным днём па загаду Лукашэнкі ў нас лічыцца дзень, калі ў 1917 годзе ў Расіі адбыўся дзяржаўны пераварот - так, дарэчы, лічаць самі расіяне, паколькі ў іх гэта "свята" не адзначаецца.



У мінулую нядзелю на могілках Гарадзеншчыны, як ніколі раней, было шматлюдна. Ведаючы, што ў панядзелак, на які ў гэтым годзе выпала свята, працоўны дзень, людзі пайшлі памінаць сваіх продкаў у нядзелю. На могілках у Індуры здавалася няма дзе ступіць нават адной нагой. Цяжка было праехаць па дарозе, паколькі на працягу з паўкіламетра па абодва бакі былі запаркаваны машыны. Увечары па радыё перадалі, што ў Курапаты з мільённага Мінска хадзіла каля тысячы чалавек.

Заканчэнне на стар. 3

МИНСК

Защищайте свои права

С сентября нынешнего года в Минске зарегистрирован и действует Центр по правам человека. Он был создан по инициативе ряда минских юристов и студентов-правоведов. Основными направлениями деятельности Центра являются: защита прав человека, оказание безвозмездной помощи гражданам в реализации их прав, гарантированных Конституцией, содействие в образовании и повышении правовой культуры общества, популяризация и пропаганда прав и свобод.

В этих целях Центр проводит семинары, лекции, конференции, выставки и иные общественные мероприятия, издает периодический бюллетень "Правозащитник", участвует в разработке альтернативного законодательства РБ, касающегося защиты гражданских прав.

Среди членов Центра по правам человека такие известные в стране юристы как М. Пастухов, М.Гриб, В.Стремковская и другие.

Подробную информацию можно получить по телефону в Минске: (017) 266-25-70.

Н.РАКИЦКАЯ

ЛІДА

У Лідзе хацелі б мець самакіраванне...

Днямі ў Лідзе адбыўся семінар па мясцоваму самакіраванню. Арганізатарамі яго выступілі фонд Фрыдрыха Эберта і Беларускі рэспубліканскі фонд падтрымкі дэмакратычных рэформ імя Льва Сапегі. На семінар былі запрошаны дэпутаты мясцовага Савета, прадстаўнікі грамадскіх і дзяржаўных арганізацый Лідчыны. Шмат гаварылі аб самакіраванні ў нашай краіне, але ўсё ж больш слухалі калі пра гэта распавядалі госці з Літвы. Нам да сапраўднага самакіравання сапраўды далёка. І калі яно яшчэ будзе таксама невядома. Але вельмі хацелася б.

Т.ЧАРНАВУС

ГРОДНА

Не паліце лісце, не паліце

Нядаўна на тралейбусах з'явіліся незвычайныя ўлёткі. Незвычайныя яны тым, што напісаны дзіцячай рукой, з памылкамі. А змест прымушае задумацца нават дарослых: юныя эколагі з СШ №9 просяць - "Не паліце, людзі лісце!"

Справа ў тым, што за цэлы год лісце накоплівае ў сябе шкодныя рэчывы, якія знаходзяцца ў атмасферы. А пры паленні ўвесь набор хімічных элементаў трапляе ў паветра, якім мы дыхаем.

Дарэчы, як нам паведамілі ў Камітэце па экалогіі, паленне ў горадзе і, у прыватнасці, смецця і лісця - забаронена.

А калі ўжо дзеці з школы №9 турбуюцца аб вашым здароўі, шаноўныя гарадзенцы, то ці не варта вам самім над гэтым задумацца?

Алеся ШПІЛЕЎСКАЯ

СВИСЛОЧЬ

Колхоз К.Калиновского помогает одиноким и престарелым


Нынешней осенью Белорусский Красный крест проводит акцию "Урожай-98 - одиноким престарелым людям".

Свислочский районный комитет этой организации обратился с призывом помочь обеспечить картофелем одиноких и престарелых граждан, которые не имеют своего огорода. Одним из первых в Свислочском районе откликнулся на этот призыв колхоз с патриотическим названием - имени К.Калиновского. Проблема лишь в том, что гораздо сложнее оказалось обеспечить людей, которые проживают в г.п. Свислочь, поскольку для них нужно было еще обеспечить доставку. Правда, в районе уже отрапортовали, что все нуждающиеся обеспечены вторым хлебом.

Г.ГИЛЬ

15 гадоў без уласнага дома...

Гэтай восенню Дзіцячая музычная школа №2 горада Гродна святкуе свой 15-гадовы юбілей.



А пачыналася з таго, што ў першыя гады існавання штат школы складаў усяго 12 чалавек: 11 выкладчыкаў і адна тэхнічка. Прычым, дырэктар, Ігар Іванавіч Тупік, па сумяшчальніцтву быў і завучам, і бібліятэкарам, і загадчыкам гаспадаркі, і нават сакратаркай-машыністкай.

У 1983 годзе школа была раскідана па ўсім горадзе: заняткі праводзіліся ў ДК "Хімікаў", Палацы піянераў, у інтэрнаце "Гроднапрамбуда", а адзін клас знаходзіўся нават у апорным пункце міліцыі.

На сённяшні дзень школа ўкамплектавана і адміністратыўна-тэхнічным персаналам, і прафесійнымі кадрамі. Створаны камерны дзіцячы ансамбль, народныя аркестры малодшых і старэйшых класаў, квартэт выкладчыкаў. Шматлікія вучні школы - дыпламанты і лаўрэаты розных алімпіяд і конкурсаў.

Штогод вучнямі ДМШ №2 становяцца каля 40 дзетак. Прычым, конкурс пры паступленні складае прыкладна тры чалавекі на месца.

Здавалася б, усё выдатна, але... за 15 гадоў так і не вырашылася праблема з памяшканнем. Галоўны корпус школы месціцца на вуліцы Савецкіх пагранічнікаў 30, у драўлянай хатцы пад вялізнай елкай каля так званага "п'янага кута". Але суседства з піўным шапікам - гэта не самае страшнае.

Памяшканне ад самага пачатку існавання школы знаходзіцца ў аварыйным стане. Збудавана яно яшчэ ў 1927 годзе. Пасля вайны тут мясціўся дзіцячы садок, затым - спартовая школа. А зараз тынкоўка сыплецца на раялі і галовы дзяцей, якія развучваюць гаммы. Да ўсяго, у школе няма паравога ацяплення і, як захаладае, тэхнічка распальвае печы.

Уладам такая сітуацыя вядома даўно. Яны нават сцвярджаюць, што шукаюць новае памяшканне. Праўда, пакуль безвынікова.

А нядаўна ў ДК "Хімікаў" адбыўся канцэрт прысвечаны 15-годдзю школы. На сцэне выступалі лепшыя з лепшых і вучні, і выкладчыкі, і выпускнікі. Іх віншавалі, дарылі кветкі і жадалі... атрымаць урэшце новы, вялікі і светлы будынак.

Юлія ДАРАШКЕВІЧ

НАВАГРУДАК

У Навагрудку пачалі рабіць новыя цвікі

Работа на перспектыву, укараненне прагрэсіўных тэхналогій, асваенне новай тэхнікі і новых відаў прадукцыі становяцца прыярытэтнымі напрамкамі ў дзейнасці Навагрудскага завода металавырабаў. Нядаўна прадпрыемства набыло станок для выпуска новых відаў цвікоў на 150, 180 і 200 міліметраў. Яшчэ да заканчэння бягучага года на прадпрыемстве плануюць запусціць новую лінію па вытворчасці электродаў. Дарэчы, дырэктар завода абяцае, што і цэны на іх новую прадукцыю задаволяць пакупнікоў.

Хто больш накапаў бульбы

Навагрудскія БПСМаўцы сумесна з райкамам прафсаюза работнікаў Аграпрамысловага комплексу па старой завядзёнцы наладзілі спаборніцтвы паміж студэнтамі, якія капалі на калгасных палетках бульбу. Як высветлілася, лепш за іншых капалі бульбу студэнты гандлёва-эканамічнага каледжа. За гэта іх узнагародзілі экскурсійнай паездкай.

Г.СЕЛЯЗЕВІЧ

Шведы адкрываюць Беларусь

На мінулым тыдні Беларусь наведалі прадстаўнікі арганізацыі маладых католікаў Швецыі (SUK). Іх мэтай было ўсталяванне кантактаў з падобнымі арганізацыямі нашай краіны. Праграма візіту шведаў распачалася з Гродна, дзе яны мелі сустрэчу з моладдзю адной з рыма-каталіцкіх парафіяў, а таксама прадстаўнікамі грэка-каталіцкай (вуніяцкай) суполкі ў Гродне.

Цікаўнасць скандынаваў да Беларусі выклікана іх жаданнем ведаць як мага больш аб краінах, якія знаходзяцца недалёка ад іх радзімы. Беларусь для рэалізацыі гэтай мэты падыходзіць выдатна, бо, напрыклад, абсалютная большасць жыхароў паўночнай дзяржавы не ведае нават назвы нашай краіны.

Акрамя Гродна госці з падобнымі мэтамі наведалі Мінск і Магілёў, якія з'яўляюцца цэнтрамі каталіцызма адпаведна ў цэнтральнай і ўсходняй Беларусі. Турнэ скандынаваў стала падрыхтоўчым этапам да сумеснага шведска-беларускага праекту, рэалізацыя якога стане магчымай пры фінансавай дапамозе шведскіх уладаў. Хутчэй за ўсё да праекту далучыцца і літоўскі хрысціянска-маладзевы саюз "Zingsnis", які і ўтварыўся тры гады таму дзякуючы прадстаўнікам "SUK". У планах Swerige Unda Katoliker наладжванне летнікаў, абмен моладдзю і правядзенне семінараў па каталіцкай тэматыцы.

Алесь Ляхіцкі

С кем поведешься - от того и наберешься

Именно эта пословица нынче применима к главному тренеру национальной сборной Беларуси по футболу Михаилу Вергеенко, который, к тому же, является и генеральным директором футбольного клуба "Динамо-Минск".

Давая интервью БТ, Михаил Никифорович заявил, что намерен создать в Беларуси на базе минского "Динамо" суперклуб. Идея, конечно же, неплохая, однако динамовский начальник желает осуществить эту цель путем добровольно-принудительного приглашения свою команду перспективных молодых игроков, играющих в белорусском чемпионате. На заметку г-н Вергеенко (по сообщению спортивной газеты "Прессбол") взял и двух игроков гродненского "Немана" - Сергея Цыбуля и Дмитрия Борисейко. Подобные действия со стороны генерального директора "Динамо-Минск" белорусская федерация футбола, в лице её президента Григория Федорова, не поддержала, осудив методы силового давления. Стоит напомнить, что Михаил Вергеенко входит в неофициальную "спортивную команду" Александра Лукашенко, нередко принимая участие в футбольных и хоккейных матчах с участием Президента. Возможно, именно там тренер футбольной сборной Беларуси научился подобным действиям.

Мирослав ОРЛОВСКИЙ

Памяць яшчэ жыве!

У суботу, 31 кастрычніка, на вайсковых могілках прайшло традыцыйнае ўскладанне кветак да крыжа, усталяванага ў памяць аб загінуўшых польскіх жаўнерах.



Акцыя прайшла напярэдадні свята ўшанавання памяці ўсіх памёршых і была арганізавана, як і ўсе папярэднія, Саюзам палякаў Беларусі. У апошнія гады да СПБ далучылася консульства РП у Гродна. Акрамя вышэйназваных арганізацыяў удзел у акцыі прынялі камітэт польскіх ветэранаў вайны пры СПБ і Беларуская арганізацыя харцэраў. Кветкі былі ўскладзены таксама і на магілы вядомых у Гродне палякаў, якія знаходзяцца на старых каталіцкіх могілках.

Алесь Ляхіцкі

наши поздравления

Мастера не поедут в Мадрид...

Стеклозавод "Неман" (поселок Березовка Лидского района Гродненской области) награжден Международной Платиновой Звездой за "выдающееся мастерство и качество в 1998 году".

Как отмечается в письме, присланном в адрес руководства предприятия председателем бизнес-презентаций Конвенции Платиновой Звезды г-ном Карлосом Пигаем, эта высокая награда — показатель международного уровня, которого достиг "Неман". "С получением этой награды вы получите новый стимул в стремлении к качеству, который приведет к высокой оценке вашего труда покупателями и будет являться мотивацией для членов трудового коллектива". — подчеркивается в послании. Между тем, представители "Немана" вряд ли смогут получить высокую награду. Дело в том, что торжественная церемония ее вручения состоится 23 ноября в столице Испании — Мадриде. В условиях острейшего дефицита валютных средств предприятие просто не может позволить себе оплату командировочных расходов на поездку за границу.

БелаПАН

Северная Корея, как она есть

Власть страха начинается тогда, когда уничтожается оппозиция

Харухиса Огава
профессор Токийского университета



Почему, собственно, Корея? - может спросить любопытный читатель. А почему бы и нет? Маленькая страна на Востоке, бедная и голодная, более 30 лет бредущая по революционной дороге под бдительным взором руководящей партии... Когда мы пытаемся заглянуть в завтрашний день, то прежде всего думаем о хорошем - вот сегодня еще плохо, но потом непременно будет хорошо. Так не всегда бывает. Если мы вспомним 1994 год, а сделать это совсем не трудно - такое недалекое прошлое - и сравним его с годом нынешним, то придем к одному весьма печальному выводу: жить стало хуже. Основной массе рядового населения, разумеется. Более того, если мы заглянем еще на четыре года вперед и постараемся быть объективными и беспристрастными, то придем к еще более печальному выводу - при сохранении нынешнего государственного курса жить станет вообще невозможно. А дальше? Не будем пророчествовать: вернемся к Северной Корее...

Все граждане Северной Кореи, согласно реализации программы регистрации граждан 1967-70 г.г., поделены на три класса - "основной" (20%), "колеблющийся" (45%) и "враждебный". Эти три класса в свою очередь делятся на 51 подкласс. Согласно этой классификации, каждый гражданин, в зависимости от того, к какому классу он принадлежит, получает определенные продовольственные нормы и род медицинской помощи. "Враждебные" находятся под постоянным политическим наблюдением. Члены этого класса в определенных ситуациях приговариваются к экзекуциям. Завершая программу, северокорейские власти, согласно декрету правительства, провели "чистку" среди "враждебного" класса, в результате было убито 6000 человек, еще 70000 были помещены в лагеря для политических заключенных. В настоящее время более чем в десяти лагерях, разбросанных по территории страны, находятся около 200000 человек.

Конституция реализует принципы коллективизма, в КНДР права и обязанности граждан базируются на принципе коллективизма: "один за всех и все за одного". При таких условиях права личности могут не учитываться. Уголовное право сконструировано таким образом, чтобы усилить принцип наследственной диктатуры. Оно содержит статьи, предусматривающие смертную казнь и денежные кары за все выступления против революционных порядков. Среди таких преступлений названо и сопротивление распоряжениям власти (статьи 44-45, 105). Уголовное право отрицает принцип "nulla poena sine lege" (нет наказания без законного основания) и дает возможность праву действовать вспять. Уголовное право заключает так сформулированные параграфы, чтобы было возможным наказание не только преступников, но и членов их семей.

Согласно конституции, все граждане Северной Кореи имеют право принимать участие в выборах и выдвигать свои кандидатуры (ст.66), им гарантирована свобода слова, печати и собраний (ст.67). Формально соблюдается демократический порядок. Однако в каждом округе коммунистическая Партия Труда выдвигает только одного кандидата. Голосующие могут опустить в урны голоса "за" и "против". В выборах принимают участие 100 процентов населения: на выборах, проводившихся 26 июля этого года, приняли участие 99,85% избирателей, из которых проголосовали "за" 100%. Пресса никогда не публикует никаких статей, которые могли бы в невыгодном свете представить политическую систему Северной Кореи. Все публикации проходят контроль партийной цензуры. Государственное Агентство Безопасности и министерство общественной безопасности (полиция) имеют своих агентов на каждом заводе и в каждой деревне. Функционирует **"система пяти домашних хозяйств"**, при которой все хозяйства данной местности делятся на группы по пять хозяйств каждая, и каждый член является информатором, доносящим на соседа.

Как утверждает конституция Северной Кореи, все общественные здания, а также фабрики, предприятия, банки и средства передвижения принадлежат государству. Частная собственность допускается только в отношении движимости, которой владелец пользуется в личных целях.

Продовольственный паек, получаемый гражданином, зависит от его общественной позиции и выполняемой работы. По официальным данным, каждый получает 700 граммов зерна ежедневно. Однако в связи с ухудшающейся хозяйственной ситуацией с 1995 года власти в Пхеньяне приостановили выдачу зерна. За последние три года в Северной Корее умерли от голода около миллиона человек.

Специалисты от пропаганды в 7 местах страны создали "места исторической борьбы" Ким Ир Сена, в 34-х - просто "исторические места". Все население страны обязано по очереди участвовать в походах к этим местам. В стране сооружено 70 бронзовых памятников Ким Ир Сена, 40000 гипсовых бюстов, 250 монументов, все граждане обязаны носить значки с изображением вождя и вешать портреты его и его сына в главном помещении своего дома. Все памятники стоили стране 530 миллионов долларов, еще 94 миллиона истрачено на организацию торжеств в честь вождя. Сын вождя имеет в настоящее время в 32 местах роскошные имения, на постройку которых израсходовано 2,5 миллиона долларов.

Иностранцы никогда не увидят инвалидов в Пхеньяне и в других больших городах. Они переселены в отдаленные районы страны. В 80-х годах был издан указ о том, чтобы все инвалиды вместе с семьями были переселены из столицы. В 1989 году была проведена акция "по вывезению" инвалидов. В 90-х Север начал вводить в жизнь программу выселения инвалидов из городов Нампо, Каессонг, Хонгийн, которые были открыты для иностранцев. Были построены специальные деревни в округе Ухранг и Хоансонг. В этих деревнях жили только карлики, отделенные от мира двойной проволокой, по которой был пропущен ток.

....Рядом - другая Корея, Южная. С "Самсунгом" и растущим автомобилестроением, с массой своих проблем, но и явными тенденциями к прогрессу и расцвету. Всегда, оказывается, есть выбор.

Подготовила Елена РАВБЕЦКАЯ
(по материалам "Корейской Международной Лиги защиты прав человека -IHRLK").

"теневой" кабинет

Из фонда президента - в кошелек пенсионера

Национальный исполнительный комитет — "теневое" правительство Беларуси — на своем заседании, прошедшем 27 октября, принял решение призвать население Беларуси поддержать справедливые требования профсоюзов о безотлагательном повышении зарплаты.

Решено потребовать, чтобы уровень тарифной ставки первого разряда был не ниже минимального потребительского бюджета (3,8 миллиона рублей), а уровень минимальной зарплаты — не ниже прожиточного минимума (2,3 миллиона рублей). Прежде, чем принимать соответствующее решение, НИК заслушал отчет Александра Соснова — бывшего министра труда в правительстве Михаила Чигиря, а ныне — председателя комитета по социальным вопросам в "теневом" правительстве. По данным, приведенным докладчиком, рост зарплаты постоянно отстает от роста цен. Если в январе размер минимальной зарплаты составлял 6 долларов, то в сентябре он уменьшился до 4,1 доллара, а в октябре — до 2,2 доллара по курсу "черного" рынка наличной валюты. Что же касается пенсионеров, то сегодня средний размер их пенсий составляет 63 цента в день. Между тем, Организация Объединенных Наций обозначила порог бедности для пенсионеров — 1 доллар в день. НИК также потребовал от президента Лукашенко незамедлительно повысить не менее чем в два раза размеры пенсий и государственных пособий. Названы и источники дополнительного финансирования – внебюджетные фонды президента, доходы его управления делами, а также средства, высвобожденные вследствие сокращения штатной численности репрессивных структур и служб охраны.


статистика

За девять месяцев 1998 года в Беларуси родилось чуть более 62 тысяч, умерло почти 90 тысяч человек. Основные причины смерти граждан Беларуси — болезни системы кровообращения, от которых в нынешнем году скончались 46 тысяч человек; различного рода новообразования и опухоли, в том числе раковые; несчастные случаи. В последней категории – лидируют самоубийства. В этом году покончили с собой почти 2500 граждан: в городах — 1366, в сельской местности — 1132 человека.

БелаПАН

Александр Шимковяк: в Гродно мы получили поддержку

В нынешнем году Гродно стал своеобразной Меккой белорусского баскетбола - сравниться с подобным количеством команд (четыре) с Гродно может лишь Минск. Сразу двукратное увеличение числа клубов с берегов Немана произошло за счет создания фарм-клуба мужского "Гродно-93", а также переезда в наш город женской команды "Гермес-УОР", ранее базировавшейся в Бобруйске. С Александром ШИМКОВЯКОМ, главным тренером последней, и состоялась наша беседа



Александр Шимковяк со своими подопечными.

- Какие причины побудили Вас на переезд в Гродно?

- Если откровенно, то чисто финансовые. В Бобруйске команда не финансировалась, а по-существу она - кадетская сборная Беларуси, кроме нескольких девочек, играющих за другие команды. Девчонки 1983-84 гг. рождения, т. е. - 9-10 классы средней школы. В Бобруйске мы получили 100-процентный отказ от финансирования, а поддержку получили здесь, в Гродно. Нам пообещали создание условий для выступления в чемпионате, а также мы получили гарантийное письмо о финансировании нашего участия в апрельском первенстве Европы среди кадеток. Кроме этого, скоро завершится строительство спортивного зала в училище олимпийского резерва, который станет для нас "родным". А значит, у нас будут оптимальные условия для роста мастерства. Поэтому выбора у нас просто не было, хотя и здесь пока есть временные неудобства. Однако условия нормальные, поэтому прогресс рано или поздно будет.

- Команда собрана со всей Беларуси?

- Нет. Баскетболистки в основном бобруйские. Есть девочки из Мостов, Вилейки и две из Минска. Самое сложное для них, конечно же, процесс адаптации - им пока тяжело, ведь они оторвались от родителей. Мне и самому тяжело, но я уже взрослый человек и достаточно повидал в своей жизни: родился в Витебске, учился в Могилеве. Осталось поработать в Гродно. Для полного боекомплекта. Я считаю, надо идти туда, где люди хотят видеть баскетбол. А в Гродно есть и желание, и традиции.

- Каковы задачи на сезон?

- Естественно, будем стараться кого-то зацепить. Конечно же, не трио фаворитов, в которое входят "Олимпия", "Горизонт" и "Березина", а четвертую-пятую команды. Реально, наше место шестое, но я не думаю, что гомельский "БелГУТ" нас будет превосходить. У них есть 192-сантиметровая центровая Елена Левченко (в последнем туре Балтийской лиги она в составе "Горизонта" была одной из лучших), которая должна для более качественной подготовки к чемпионату Европы играть в базовом клубе кадетской сборной, т. е. у меня. Однако определенные препоны в этом плане нам создала федерация. К сожалению, в Минске не адекватно реагируют на успехи периферийных команд - их сразу начинают "душить". Мои девчонки 83-го года рождения в своем возрасте за три последних года не проиграли ни одного национального чемпионата.

Александр ДВОРЕЦКОВ
Фото Ярослава ВАНЮКЕВИЧА

Лукашэнка святкуе рускую рэвалюцыю. У Заходняй Беларусі адзначалі Дзяды

Пачатак на стар. 1

У невялікім мястэчку Поразава Свіслацкага раёна на каталіцкіх могілках было таксама шматлюдна. Ня гледзячы на дождж, людзі доўгі час заставаліся каля магілак родных, запальвалі знічы. Калі наступілі прыцемкі, могілкі сталі нагадваць нешта незвычайнае - агенчыкі знічаў паліліся цэлую ноч. Так як і ва ўсёй Еўропе. Дарэчы, усе магілкі да гэтага свята былі прыбраны. На паразоўскіх могілках ёсць адзін помнік, які адразу кідаецца ў вочы. - Казіміру Шалкевічу і паўстанцам 1863 года. Ён таксама дагледжаны і на ім гарэлі самыя вялікія і прыгожыя знічы.


Самым дзіўным было ў гэты дзень на далёкіх ад Гродна местачковых паразоўскіх могілках сустрэць дэлегацыю Консульства Рэспублікі Польшча ў нашым горадзе. Разам з прадстаўнікамі Саюза палякаў Беларусі ў гэты дзень яны ўшанавалі памяць людзей, якія некалі аддалі жыццё ў змаганнях за Польшчу - у Вялікай і Малой Бераставіцы, Макараўцах, Свіслачы і Поразава. Нашы ж улады ў гэты дзень не правялі ніводнага культурнага мерапрыемства ва ўсёй вобласці.

Позна вечарам практычна ўсю праграму польскіх навінаў займала інфармацыя аб ушанаванні продкаў па ўсёй краіне. У беларускіх навінах - прэзідэнт Лукашэнка "абараняе" новы ўрад Расіі, якому розныя шкоднікі не даюць працаваць. І нічога аб тым, што ў сваіх крамах няма цукру, што прадукты сталі недаступнымі для насельніцтва з-за нізкіх заробкаў...


М.КАРНЕВІЧ

Страчаная спадчына

Шаноўны чытач! Мы працягваем знаёміць цябе з гісторыяй нашага горада. Апісанне вуліцаў падаецца ў алфавітным парадку. Чытай папярэднія нумары.



Самы вялікі і прыгожы драўляны касцёл у Вялікім княстве і першая гарадзенская Ратуша на варыянце гравюры Адельгаузера-Цюндта.



Від Ратушнай плошчы. Малюнак Напалеона Орды, зроблены хутчэй за ўсё з акна гродзенскай турмы.

Савецкая плошча ў Гродне


Частка Савецкай плошчы - гэта Рынак у Гродне, галоўны Гродзенскі Рынак, Ратушная плошча, Парадная плошча, plac Stefana Batorego - гандлёвая плошча горада, якая сфарміравалася, відаць, у канцы XIУ стагоддзя. З фундацыі князя Вітаўта (1389 г.) на ёй быў пабудаваны да пачатку XV ст. драўляны Фарны касцёл, які па прызнанню папскага нунцыя Кантэльмі ў 1586 годзе, з'яўляўся самым вялікім і самым прыгожым драўляным касцёлам у Вялікім Княстве Літоўскім.

Як бы там не было, але я разам з сваімі калегамі - ксяндзом Пашэндай, прафесарам архітэктуры Кракаўскага Ягелонскага універсітэта, А.Мілінкевічам, дацэнтам Гродзенскага універсітэта, гісторыкамі Алегам Трусавым і Алесям Краўцэвічам у выніку гістарычных даследаванняў высветлілі, што паміж 1585 і 1587 два касцёлы: лепшы і самы прыгожы - драўляны, і новы -каменны, іезуіцкі стаялі побач. Але іезуіты пасля смерці Стэфана Баторыя не прынялі яго фундацыі і стары драўляны фарны касцёл быў разабраны, а непрыняты іезуітамі храм стаў прыхадскім.


Гараджане ведаюць гісторыю гэтага храма, так званай Фары Вітаўта. У 1806 годзе ён стаў праваслаўным саборам, а ў 20-ыя гады XX ст, пасля няўдалай рэстаўрацыі - Гарнізонным касцёлам. А ў 1961 гоодзе ён быў узарваны савецкімі уладамі.

Непасрэдна тэрыторыя старога гродзенскага Рынка супадае зараз з тэрыторыяй сквера на Савецкай плошчы паміж будынкамі бібліятэкі імя Карскага і прыпынкам тралейбусаў і аўтобусаў. На тэрыторыі гэтага сквера, прыкладна на месцы кіёска "Кока-кола", у XVI-XVIII ст. існаваў так званы Магдэбургскі калодзец, які верагодна ўваходзіў у сістэму дапатопнага гродзенскага вадаправода. Драўляныя трубы першага гродзенскага вадаправода XVI-XVII ст. былі знойдзены падчас земляных работ у 1958 годзе.

Калі гродзенцы гуляюць у наваголнюю ноч пад елкай на плошчы, то напэўна не здагадваюцца, што на невялікай глыбіні пад імі знаходзяцца скляпенні гродзенскай Ратушы, разабранай пасля вайны. Дарэчы, савецкія падручнікі лгуць наконт таго, што Ратуша была разбіта ў 1944 годзе. Яна была адносна цэлай яшчэ ў 1946 годзе. Шмат хто напэўна нават і не здагадваецца, што на месцы вялікага сквера з фантанам гэтая тэрыторыя была занята забудовамі палаца і юрыздыкі князёў Радзівілаў.



Плошча ў 1884 годзе.



Здымак Савецкай плошчы з 1946 года. На ім добра відаць, што Ратуша цалёханькая.



Рэзідэнцыя князёў Сангушак XVIII ст. Перад гэтым ў XVII ст. - палац Зеленугі, у XVI ст. - Магдэбургская карчма.

Гістарычная забудова Савецкай плошчы моцна пастрадала падчас Першай Сусветнай вайны, верасня 1939 года, у 1941 і 1944 гадах. Але не менш яна страціла ў пасляваенныя гады. Акрамя таго, што разабралі Ратушу, Замкавы двор (на яго месцы стаіць палац Тэкстыльшчыкаў), узарванай Фары Вітаўта, была яшчэ "чистка" па генеральнаму плану 1949, пасля якой ужо немагчыма пазначыць межы старой Рыначнай плошчы. З гэтага можна зрабіць выснову, што ў сілу натуральных прычынаў - войнаў, а таксама варварскіх адносінаў да культурнай спадчыны свайго народа ў пасляваенныя гады Савецкая плошча ў значнай ступені страціла гісторыка-культурную і архітэктурную каштоўнасць. Практычна ўвесь час хадзілі размовы аб тым, каб адрэстаўраваць плошчу. Але размовы вялікіх начальнікаў так і засталіся размовамі. Шматпакутны будынак бібліятэкі імя Карскага браліся рэстаўраваць і палякі, і французы, і хто толькі не браўся... У выніку - будынак разрабаваны ўнутры і паволі развальваецца. А вінаватым зрабілі дырэктара абласной бібліятэкі, а па-сапраўднаму вінаватых не зможа дастаць нават абласная пракуратура.

Мне давялося ўдзельнічаць у 1991-1994 гадах у гістарычных даследаваннях па аднаму з самых цікавых аб'ектаў гістарычнай забудовы Савецкай плошчы - рэзыдэнцыі князёў Сангушак (былая крама "Цацка" на вуглу Савецкай плошчы і Савецкай вуліцы) пачатку ХУIII ст. Было праведзена шмат працы ў Вавельскім архіве ў Кракаве, у фондах Эрмітажа, былі нядрэнныя праекты... За будынак узяліся толькі цяпер, але аб тым, як гэта робіцца, лепш не ўзгадваць.

І яшчэ. Падчас паседжання тапанімічнай камісіі, калі вырашалася пытанне з наданнем Савецкай плошчы яе гістарычнай назвы - Рынак, Рыначная плошча, адзін надзелены ўладаю чыноўнік на гэта сказаў: "В Гродно и так базаров хватает, а вы хотите в центре сделать ещё один."

Савецкая плошча 4. Іезуіцкі касцёл і калегіўм - аб кляштары ў нас будзе надрукаваны асобны матэрыял.

Савецкая плошча 2. Год забудовы - 90-ыя гады XIX ст. Дом купца Мураўёва. Узор архітэктуры мадэрн. Думка аб даце забудовы аб'екта гродзенскага археолага Рыгора Акінчыца найбольш абаснавана. Да ўсяго, Акінчыц верагодна найбольш дасканала ведае гісторыю рода Мураўёвых.







Фара Вітаўта ў 1881, 1912, 1936 годзе.

Ігар ТРУСАЎ,
гісторык архітэктуры.
Усе здымкі выкарыстаны з асабістага архіва І.ТРУСАВА.

ДЗВЕ БОМБЫ КАЛЯ АЛТАРА

Як разбурылі Фару Вітаўта і хацелі знішчыць Фарны касцёл

Гэтую гісторыю расказала Марыя Рамуальдаўна Гратулевіч, якая з 1941 года даглядала Фарны касцёл і была сведкай усіх падзей, што разгортваліся вакол яго.

Калі немцы распачалі вайну з Савецкім Саюзам, Гродна пачалі бамбіць. Пад час аднаго з такіх налётаў дзве бомбы патрапілі ў будынак касцёла. Яны прабілі дах і ўпалі каля алтара. На дзіва, бомбы не разарваліся. Так і стаялі некаторы час вертыкальна ўваткнуўшыся ў падлогу, а імшу тады правілі ў бакавым алтары. Наогул жа нямецкае начальства пад час акупацыі не хадзіла ў касцёл, аднак ніхто таксама не забараняў праводзіць набажэнствы. Але будынак, канешне, вельмі пацярпеў у час вайны. Пасля сп–р Гратулевіч, муж Марыі Рамуальдаўны, сам зрабіў рамонт у касцёле. Шыбы, якія ён уставіў, засталіся дагэтуль.

Пры савецкай жа ўладзе ксяндзы доўга не трымаліся на сваёй пасадзе. Праз год–два пасля прыезду яны вярталіся назад у Польшчу. Даўжэй за ўсіх прабыў у Гродне ксёндз, да якога хадзілі абедаць афіцэры КДБ. Ён пражыў тут 13 гадоў і стараўся не канфліктаваць з уладамі—толькі такой цаной яму ўдалося ўтрымаць касцёл. У 50–я гады пачаліся арышты. Сп–ню Марыю выклікалі ў КДБ і прапанавалі "працу"—даносіць пра кожнае слова, што скажа святар. Яна адмовілася. Пасля гэтага ксёндз з'ехаў у Польшчу, наступны— таксама. Дайшло да таго, што ў Гродне застаўся адзіны святар— у "Бернардынках". Наколькі мне вядома, ён чамусьці не быў зацікаўлены ў тым, каб у Фарным касцёле таксама быў свой святар.

Настаў 1961 год, і ўлады ўзяліся за Фару Вітаўта. Рыхтаваліся доўга. З Ленінграду прывезлі брыгаду вайскоўцаў і 2 тоны выбуховых рэчываў. Цэлы месяц яны свідравалі ў фундаменце дзіркі ды закладалі ў іх узрыўчатку. Такая складаная працэдура праводзілася спецыяльна, каб знішчыць касцёл і не пашкодзіць навакольныя будынкі. Кнопка, націснуўшы на якую, разбурылі Фару Вітаўта, знаходзілася ў будынку бібліятэкі на Савецкай плошчы. Выбух прагрымеў а палове другой уначы. Касцёл асеў, а крыж, як быў, вертыкальна ўваткнуўся ў зямлю і застаўся стаяць. Раніцою вакол сабралося шмат людзей—усе збіралі на памяць кавалачкі цэглы, што засталіся ад падмуркаў. Нейкі прахожы ўкленчыў перад руінамі і сказаў:" Крыж застаўся стаяць. Што б бальшавікі не рабілі—вера застанецца на гэтай зямлі..." Вялізную колькасць цэглы і абломкаў прыбралі за два дні. За гэта рабочым абяцалі даць па 600 рублёў кожнаму, але яны так і не дачакаліся гэтых грошай.

Наступным у разбуральных планах уладаў быў Фарны касцёл (Езуіцкі). Але, дзякуючы намаганням касцельнага камітэта, у які уваходзіла тая сама і Марыя Гратулевіч, начальства на некаторы час забылася на гэтую справу. Улады пабаяліся пратэстаў простых людзей. Але ў 80–я гады зноў вырашылі ўзяцца за касцёл – яны паставілі няпросты ўльтыматум: або здаць ключы, або распачаць рамонт "своими силами". Гэта быў папросту здзек. Мала таго, што грошай не было, а касцёл павінен быў плаціць падатак 600 рублёў у год, дык у будынку яшчэ адключылі святло. Рамонт таксама перашкаджалі рабіць. Чыноўнікі не дазвалялі фарбаваць драўляныя скульптуры святых, якія ад бруду ўжо пачалі гнісці. Маўляў, гэта помнік архітэктуры і тут патрэбныя спецыялісты. Зразумела, што прафесійных майстроў яны не выклікалі. Давялося, каб начальства не заўважыла розніцы, намяшаць фарбу, якая колерам нагадвала бруд.



1961 год. Узарвалі Фару Вітаўта.

